

# ГАЛУБЦОВА ВОЛЬГА СЯМЁНАЎНА

**(1903-1974)**

**Герой Сацыялістычнай Працы**



Галубцова Вольга Сямёнаўна нарадзілася 10.02.1903 г. у в. Свіслачаны Гродзенскага павета (зараз – Гродзенскі раён).

Працоўную дзейнасць пачала ў 1915 годзе ў Пецярбургу. Неўзабаве пераехала ў Беларусь, у вёску Райцы Талачынскага раёна. Калі арганізаваўся калгас, стала працаваць даяркай. З 1922 па 1961 год – даярка саўгаса “Райцы” (з 1965 года – племзавод “Рэканструктар”). Паслядоўна ўдасканальвала сваё майстэрства, настойліва навучылася перадавым прыёмам працы. Паступова вырасла ў сапраўднага майстра сваёй справы. З моманту адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы ў Маскве была нязменным яе ўдзельнікам. Будучы даяркай саўгаса “Рэканструктар”, А.С. Галубцова ў 1958 годзе надаіла ад кожнай з 11 кароў па 4278 кілаграмаў малака.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў снежні 1958 года за высокія дасягненні ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Узнагароджана залатым медалём “Серп і Молат” Героя Сацыялістычнай Працы, ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

**Літаратура:**

1. Голубцова Ольга Семёновна, доярка // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биогр. справ. / сост. И.Н. Кулан [и др.] ; под общ. ред. А.Н. Новикова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2014. – С. 74-75.

2. Крижановский, М. Большое молоко // Знаменосцы трудовой славы / сост. Г.С. Гужва, В.Г. Скопа, Е.Я. Рыклин. – Минск: Беларусь, 1984. – С. 74-77.

3. Крыжаноўскі, М.А. Акрыленая працай // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. : І.П. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1988. – С. 602-603.

**Інтэрнэт-рэсурс:**

1. Знаменитые люди Толочинского района : Толочинский районный исполнительный комитет : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : tolochin.vitebsk-region.gov.by.